**І. Э. Хілюта,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Ваўкавыска

# Засваенне новай лексікі малодшымі школьнікамі праз тэматычны падыход

**Тэма:** Віды сказаў (3 клас)

**Мэта:** у канцы ўрока вучні павінны ведаць асаблівасці розных відаў сказаў і ўмець вызначаць іх у маўленні.

**Задачы:**
- арганізаваць дзейнасць па паўтарэнню ведаў пра сказы па мэце выказвання і па інтанацыі;
- фарміраваць уменне ўжываць адпаведныя знакі прыпынку пры іх афармленні на пісьме;
- садзейнічаць развіццю арфаграфічнай зоркасці, мыслення, звязнага маўлення;
- ствараць умовы для ўзбагачэння слоўнікавага запасу дзяцей;
- выхоўваць цікавасць да роднай мовы, павышаць узровень пазнавальнай актыўнасці.

**Абсталяванне:** падручнік, карткі для групавой, парнай і індывідуальнай работы, кластэр-табліцы, мульцімедыйная прэзентацыя, электронны трэнажор “Беларуская мова- 3 клас”.

## Ход урока

| Этап | Змест | Метады і прыёмы ўзбагачэння слоўнікавага запасу | Формы навучання |
|---|---|---|---|
| | **І. Арганізацыйна-матывацыйны этап** | | |
| ***1.Арганізацыйны момант і матывацыя (каля парт)***<br>*1 хв.* | *Весела гучыць званок.*<br>*Яго голас вам знаёмы.*<br>*Запрашаю на ўрок*<br>*Беларускай мовы!*<br><br>У пачатку ўрока я хачу даведацца пра ваш настрой.<br>*Гульня “Вясёлка настрою”*<br>Назавіце свой настрой, выкарыстоўваючы колеры вясёлкі:<br>**Чырвоны** – ВЯСЁЛЫ | Тэма “Колер” | Індывідуальная |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Аранжавы - БАДЗЁРЫ<br>Жоўты - ДОБРАЗЫЧЛІВЫ<br>Зялёны – СУР ' ЁЗНЫ<br>Блакітны - РАЗГУБЛЕНЫ<br>Сіні - СУМНЫ<br>Фіялетавы - ТРЫВОЖНЫ | *Гульня “Вясёлка настрою”* | |
| ***2. Пастаноўка вучэбных задач***<br>*2 хв.* | Якой будзе тэма нашага ўрока, вы здагадаецеся, калі ўважліва паслухаеце мае пажаданні і выкарыстаеце першыя літары названых слоў.<br>Я жадаю вам на ўроку беларускай мовы быць **С**тараннымі, **К**емлівымі, **А**ктыўнымі і **З**адаволенымі сваёй працай…<br>Як вы лічыце, якой будзе тэма нашага ўрока? (Сказ)<br>**Тэма**: Віды сказаў.<br>Сфармуліруйце задачы ўрока, устаўляючы патрэбныя словы.<br>**Задачы ўрока:**<br>*-паўтараць…;*<br>*-вучыцца вызначаць … ;*<br>*-развіваць … , папаўняць …. .* | *Актыўны метад* | Франтальная |
| ***3.Арфаграфічная хвілінка. Электронны трэнажор 3 клас***<br>*3 хв.*<br><br>*Праца па картках* | Паглядзіце на экран, выберыце патрэбную літару або літары і растлумачце свой выбар.<br>ЛЕБЕ **(ДЗ)** Ь ДЗЯ(**Ц**)ЕЛ<br>У**(Д)**ОД ІН**(Д)**ЫК<br>**(Д)**РАЧ КРЫЖА**(ДЗ)**ЮБ<br>Як назваць адным словам, хто гэта? (ПТУШКІ)<br>Якая з іх лішняя і чаму?<br>*4 вучня працуюць па картках.*<br>**К1. Устаў прапушчаныя літары. Абвядзі ў кружок лічбы побач з пабуджальнымі сказамі.**<br>1) Зараз жа мый рукі і с…дай за стол!<br>2) Дзеці вес..ла плёскаліся ў р…чцы.<br>3) Хто любі…ь чытаць кнігі пра падарожжа?<br>4) Пеця, будзь ласкавы, зрабі цішэй гук т…левізара.<br>5) Пекар п…чэ духмяныя булкі.<br>6) Сустракайце нас праз два месяцы.<br>**К2. Устаў прапушчаныя літары і патрэбныя знакі прыпынку пасля кожнага сказа.** | *Арфаграфічная гульня* | Франтальная<br><br>Індывідуальная |

<table>
<tr>
<td></td>
<td><table><tr><td>А вы ведае…е, хто ж…ве пад нашым ганкам(…) Ніколі не здагадаецеся(…) Старая жа…ка(…) Чаму старая(…) Дык яна ж многа г…доў там ж…ве (…) Пас…бруйце з ёй (…)</td></tr></table></td>
<td></td>
<td></td>
</tr>
<tr>
<td>4.Чыстапісанне.<br>4хв.</td>
<td>Літара, якую будзем пісаць на чыстапісанні, знаходзіцца ў слове птушкі. Яна абазначае гук процілеглы парнаму звонкаму [б] .<br>Які? [п] . А літара? (пэ)<br>Якая заканамернасць схавалася ў чыстапісанні вам дапаможа здагадацца сказ? Які будзе працяг?<br><br>Пп ць Пп це Пп … (ці Пп цё Пп ця Пп цю)<br>Птушку пазнаю…ь па палё…е, а чалавека – па рабо…е.<br><br>Што гэта за сказ? Ахарактэрызуйце яго.<br>Як разумееце сэнс прыказкі? (Вось і па нашай рабоце на ўроку нашы госці змогуць пра нас даведацца)<br>Спішыце каліграфічна правільна прыказку.</td>
<td></td>
<td>Індывідуальная</td>
</tr>
<tr>
<td></td>
<td>ІІ. Аперацыйна- пазнавальны этап</td>
<td></td>
<td></td>
</tr>
<tr>
<td>1.Актуалізацыя тэарытычных ведаў.<br>5хв.</td>
<td>Складанне картак памяці.<br>Вучні павінны знайсці сярод прапанаваных картак тыя, якія характэрызуюць іх сказ і наклеіць у табліцу.<br><br>1 група: карта памяці “Апавядальны сказ”<table><tr><th colspan="2">Апавядальны сказ</th></tr><tr><td>Што выказваюць?</td><td>Паведамляюць пра падзеі, думкі і пачуцці.</td></tr><tr><td>Знакі прыпынку</td><td>У канцы сказа ставіцца кропка</td></tr><tr><td>Асаблівасці</td><td>-</td></tr></table><br>2 група: карта памяці “Пытальны сказ”<table><tr><th>Пытальны сказ</th></tr></table></td>
<td>ТРКМ<br>“Кластар”</td>
<td>У групах<br>(6 груп)</td>
</tr>
</table>

<table>
<tr>
<td></td>
<td>
<table>
<tr><td>Што выказваюць?</td><td>Пра што-небудзь пытаюцц</td></tr>
<tr><td>Знакі прыпынку</td><td>У канцы сказа ставіцца пытальнік</td></tr>
<tr><td>Асаблівасці</td><td>Ёсць пытальныя словы: ці, колькі, які, калі, хіба, дзе</td></tr>
</table>
<br>
3 група: карта памяці “Пабуджальны сказ”
<table>
<tr><th colspan="2">Пабуджальны сказ</th></tr>
<tr><td>Што выказваюць?</td><td>Выражаюць пажаданне, заклік ла дзеяння, загад, просьбу, параду</td></tr>
<tr><td>Знакі прыпынку</td><td>У канцы сказа ставіцца кропка або клічнік</td></tr>
<tr><td>Асаблівасці</td><td>Ёсць словы-“памочнікі”: давайце (давай), няхай (хай)</td></tr>
</table>
Праверка выкананых работ груп.<br>
Па якім крытэрыі выдзяляюць гэтыя сказы? (па мэце выказвання)<br>
<br>
А які яшчэ існуе крытэрый? (па інтанацыі)<br>
Складзем карту памяці.<br>
Карта памяці “Клічны сказ”
<table>
<tr><th colspan="2">Клічны сказ</th></tr>
<tr><td>Што выказваюць?</td><td>Выражаюць пажаданне, моцнае пачуцце, рывітанне, віншаванне</td></tr>
<tr><td>Знакі прыпынку</td><td>У канцы сказа ставіцца клічнік</td></tr>
<tr><td>А аблівасці</td><td>Могуць сустракацца пытальныя словы.<br>(Ёсць словы-“памочнікі”: эх, ох, ух, ах, ой, ай)</td></tr>
</table>
А якія яшчэ ёсць асаблівасці клічных сказаў вы даведаецеся праз некалькі хвілін.
</td>
<td></td>
<td>Франтальная</td>
</tr>
</table>

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***2.Прымяненне ведаў на практыцы.***<br>*5 хв.* | А зараз мы з вамі крыху пасмяемся і  праверым вашы веды па тэме “Сказ”.<br>Прачытайце смяшынку. Ахарактарызуйце кожны сказ.<br>Віця кажа тату.<br>- Тата, давай гуляць у футбол.<br>- А як мы будзем гуляць?<br>- Ты забірай у мяне мяч, а я буду плакаць.<br><br>Прачытайце смяшынку. Ахарактарызуйце кожны сказ.<br>- Міхаська, што ты робіш?<br>- Пішу пісьмо Алінцы.<br>- Ты ж яшчэ пісаць не ўмееш!<br>- Ну і што! І  яна ж чытаць не ўмее! | | Франтальная |
| ***Фізхвілінка “Беларусь мая”***<br>*3 хв.* | Давайце адпачнем.<br><br>Танцавальна-рухальная фізхвілінка | | |
| ***3. “Адкрыццё” новых ведаў. Работа па падручніку.***<br>*5хв.* | **Практ. 136, с. 78**<br>Клічныя сказы маюць словы-“памочнікі” як і пабуджальныя. Толькі зусім іншыя: эх, ох, ух, ах, ай, ой, вох. Яны дапамагаюць найбольш выразна выказаць пачуцці гаворачага.<br>Прачытаем клічная сказы. Назавіце словы--“памочнікі”.<br>**Практ. 137, с. 78**<br>З дапамогай спецыяльных слоў і інтанацыі ператварыце сказы ў клічныя.<br>Запісаць 3 і 4 сказы (на дошцы) | | Франтальная |
| | **І І І. Кантрольна-ацэначны этап.** | | |
| ***1.Лексічная хвілінка.***<br>*3хв.* | Вазьміце карткі **аранжавага** колеру і знайдзіце назвы птушак, якія схаваліся сярод літар замежнай мовы.<br>*Гульня  “ У пошуках птушак”*<br>GЗЯFЗЮWЛSZЯJ<br>NЦGЕЦSЯPLSУК<br>SQПWRУГRJАЧN<br>JWЧАQGПSNЛЯ | Тэма “Птушкі”.<br><br>*Гульня “ У пошуках птушак”* | У парах |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | LДЗSЯGЦRЕЛZW<br>Якіх яшчэ вы ведаеце птушак? | | |
| ***2.Замацаванне вывучанага. Самастойная работа***<br>*5хв.* | На картках **белага** колеру прапануецца прачытаць 3 сказы, вызначыць від сказа паводле мэты выказвання і паставіць знакі прыпынку ў канцы кожнага з іх.<br>1 рад:<br>У вясновым лесе гучна кукавала зязюля<br>Колькі разоў пракукавала зязюля<br>Знайдзіце зязюлю ў энцыклапедыі<br><br>2 рад:<br>Дзе хаваецца пугач ад сонечнага святла<br>Драпежны пугач палохае ўначы звяроў і птушак<br>Намалюйце пугача<br>3 рад:<br>Не палохайце шэрую чаплю<br>Як чапля будуе сваё гняздо<br>Прыгожая чапля нерухома стаіць на адной назе<br><br>Самаправерка ў адпаведнасці з узорам.<br>**. ? .** \| **? . .** \| **! ? .** | | Індывідуальная |
| **3.** ***Слоўнікавая работа***<br>*5 хв.* | А ведаеце, што ў Беларусі з 2000 г.арганізацыя аховы птушак выбірае птушку года**.**<br>Галоўная мэта гэтай арганізацыі – прыцягнуць увагу насельніцтва да хараства прыроды і птушак, што жывуць вакол нас.<br>У мінулыя гады сімваламі Беларусі былі: бусел, пліска, верабей, ластаўка, кнігаўка, салавей, чапля, гусь, удод, зязюля, сава.<br>Птушка 2016 года – гогаль.<br>*Расказаць пра сябе яна можа толькі па-руску, а так як у нас урок беларускай мовы, мы паспрабуем зрабіць вусны пераклад тэксту.*<br>**Гоголь - красивая утка. У её короткий клюв, чёрно-белое оперенье и глаза жёлтого цвета. Живёт гоголь в дуплах деревьев по берегам рек и озёр. Питается жуками, стрекозами, мошками и** | | Франтальная |

<table>
<tr>
<td></td>
<td><table><tr><td>даже мелкой рыбой. В полёте птицу можно определить по «свисту» крыльев.</td></tr></table>
Птушку наступнага года выбяруць у студзені.<br>
Птушцы гогалю так спадабалася беларуская мова, што яна хоча паглядзець, як добра вы вучыце тэматычныя групы слоў.<br>
На картках ружовага колеру трэба перакласці і запісаць словы па-беларуску.<br>
2 вучня працуюць каля дошкі.
<table>
<tr><th>Дзяўчынкі:</th><th>Хлопчыкі:</th></tr>
<tr><td>сентябрь-<br>январь -<br>март -<br>июнь-<br>октябрь-<br>декабрь-<br>август-<br>май-<br>февраль-</td><td>вопрос-<br>дневник-<br>мел-<br>учительница-<br>учебник-<br>знания-<br>тетрадь-<br>отметка-<br>бумага-</td></tr>
</table>
Узаемаправерка.</td>
<td>Гульня “Перакладчыкі”</td>
<td>Індывідуальная</td>
</tr>
<tr>
<td>4.Вынік урока. Выстаўленне адзнак.<br>1 хв.</td>
<td>Над якой тэмай сёння працавалі?<br>
Прадоўжыце сказы:<br>
Па мэце выказвання сказы бываюць…<br>
Па інтанацыі сказы бываюць…<br>
Якое заданне ўрока выклікала цяжкасці?</td>
<td>Актыўны метад</td>
<td></td>
</tr>
<tr>
<td>5. Інструктаж па выкананні дамашняга задання. 1хв.</td>
<td>Кожны вучань выцягвае картку з назвай птушкі.
<table><tr><td>верабей</td><td>бусел</td><td>дзяцел</td><td>ластаўка</td><td>снягір</td></tr></table>
Трэба скласці па аднаму сказу кожнага віда паводле мэты выказвання.</td>
<td></td>
<td></td>
</tr>
<tr>
<td>6.Рэфлексія<br>2хв.</td>
<td>Гульня “ПАХВАЛІ”<br>
Карыстаючыся словамі- памочнікам, падзякуйце сваіх аднакласнікаў за ўрок…<br>
✓ За творчасць;<br>
✓ За добрыя паводзіны;<br>
✓ За дапамогу сябру;</td>
<td>Гульня “Пахвалі”</td>
<td>Індывідуальная</td>
</tr>
</table>

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ✓ За набытыя веды;<br>✓ За акуратна выкананую работу;<br>✓ За актыўную работу;<br>✓ За ….<br>Дзякуй усім за ўрок! Развітацца з вамі хачу радкамі верша:<br>*Каб белы свет не здаўся вузкім,*<br>*Каб годна жыць сярод людзей,*<br>*Любіце мову беларуску,*<br>*Любіце з кожным днём мацней!* | | |

**Літаратура**


1. **Короткевич, З. В.** Развитие критического мышления учащихся начальных классов посредством чтения и письма/ З.В. Короткевич, Е.В. Маскевич. – Мозырь: Содействие, 2008.
2. **Слоўнікавая скарбонка для пачатковых класаў:** беларуска-рускі, руска-беларускі тэматычны слоўнік / склад.: В.М. Макеўніна [і інш]; пад рэд. В.М.Макеўнінай. – Мазыр : Содействие, 2009.
3. **Сыско, І. Г.** Шляхі да роднай мовы/І.Г.Сыско. – Мазыр: Содействие, 2008.